Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў

Арганізацыя Аб'яднаных Нацый па пытаннях адукацыі, навукі і культуры (ЮНЕСКА)

Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь

Галоўнае ўпраўленне культуры Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта

Жыткавіцкі раённы выканаўчы камітэт

## Рэгіянальны фестываль нематэрыяльнай культурнай спадчыны

# «КАРАГОДНАЕ КОЛА»

в. Пагост, г. Тураў

Жыткавіцкі раён

Гомельская вобласць



6–7 мая 2024

Рэгіянальны фестываль нематэрыяльнай культурнай спадчыны «КАРАГОДНАЕ КОЛА» адбудзецца 6–7 мая 2024 г. у рамках рэалізацыі плана аховы вясновага абраду «Юраўскі карагод» у в. Пагост Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці пры фінансавай падтрымцы Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па пытаннях адукацыі, навукі і культуры (ЮНЕСКА).

Вясновы абрад «Юраўскі карагод» в. Пагост Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці ў 2019 г. уключаны ў Спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА, якой патрабуецца тэрміновая ахова. У мэтах захавання жыццяздольнасці адметнай мясцовай традыцыі ўстановай адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» у супрацоўніцтве з Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь, Галоўным упраўленнем культуры Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта, Жыткавіцкім раённым выканаўчым камітэтам рэалізуецца грунтоўная праграма мерапрыемстваў пры падтрымцы Фонду нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА. Адным з буйнейшых мерапрыемстваў гэтай праграмы з'яўляецца рэгіянальны фестываль нематэрыяльнай культурнай спадчыны «КАРАГОДНАЕ КОЛА», які пачнецца пасля правядзення Юраўскага абраду ў в. Пагост (6 мая) і прадоўжыцца ў г. Тураў (7 мая).

Мэтамі фестывалю нематэрыяльнай культурнай спадчыны з'яўляюцца:

падтрымка супольнасці носьбітаў і пераемнікаў вясновага абраду «Юраўскі карагод» у в. Пагост і іншых вёсках Жыткавіцкага раёна, дзейнасці мясцовага цэнтра традыцый на базе філіяла «Пагосцкі клуб-бібліятэка» ДУК «Жыткавіцкі раённы цэнтр народнай творчасці і арганізацыі вольнага часу насельніцтва»;

пашырэнне практыкі правядзення традыцыйных Юраўскіх свят у вёсках Жыткавіцкага раёна;

узаемаабмен творчым вопытам дзейнасці носьбітаў і пераемнікаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны розных рэгіёнаў Беларусі;

ушанаванне памяці і творчых дасягненняў носьбітаў нематэрыяльнай спадчыны, якія ўнеслі вялікі ўклад у аднаўленне і захаванне культурных традыцый свайго краю;

аднаўленне, развіццё і папулярызацыя адметных праяў нематэрыяльнай культурнай спадчыны Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці;

стварэнне дыялогавай пляцоўкі з удзелам экспертаў, даследчыкаў, навукоўцаў, кіраўнікоў і спецыялістаў устаноў культуры і адукацыі па пытаннях рэвіталізацыі і папулярызацыі нацыянальных традыцый, захавання культурнай разнастайнасці рэгіёнаў Беларусі.

У фестывалі прымуць удзел народныя фальклорныя калектывы адметнага культурнага рэгіёну старажытнай Тураўшчыны «Міжрэчча», «Дубравіца», «Веціца», «Спасаўка», «Сцвіжанка», «Запясочанка», «Абібок», «Лянок», «Хільчанка», фальклорныя калектывы і клубы з суседніх раёнаў – «Каханачка» з Лельчыцкага, «Лявоніха» з Петрыкаўскага і «Напарачка» з Любанскага раёнаў. Са сталічнага рэгіёну на фестываль прыедуць узорныя дзіцячыя фальклорныя калектывы «Калыханка» з Мінскага і «Вянок» з Валожынскага раёнаў, Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь «Гасцінец» з аг. Ракаў, спеўны гурт «Стажары» РМГА «Студэнцкае этнаграфічнае таварыства» з г. Мінска.

Паўнапраўнымі ўдзельнікамі Юраўскага свята стануць студэнты Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, якія на працягу свайго навучання ў цесных стасунках з носьбітамі традыцый Тураўшчыны спасцігалі мастацтва традыцыйнага спеву і таямніцы народных традыцый. З Вялікага Ноўгарада на фестываль прыедзе фальклорны тэатр «Кудзесы», які ў мастацкай форме раскажа пра Юраўскія традыцыі сваго рэгіёну.

У праграме фестывалю – святочны канцэрт «Вясна-красна на ўвесь свет!» у в. Пагост і канцэрт-прэзентацыя «Захавальнікі спадчыны» ў Тураўскім гарадскім доме культуры, гульнёва-танцавальныя пляцоўкі для ўсіх гасцей свята і вечарынка беларускіх традыцыйных танцаў з удзелам мясцовай моладзі, творчая акцыя «Песні над Прыпяццю», культурна-адукацыйныя праграмы па краязнаўству Тураўшчыны і адметная фотавыстаўка «Дакрануцца да спадчыны душой», падрыхтаваная Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь у гонар 20-годдзя Канвенцыі аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны.

## 6 мая 2024 года

**Юраўскія абрады на Тураўшчыне**
вёскі Пагост, Чэрнічы, Старажоўцы, аграгарадок Рычоў
9.00 – 12.00

**Юраўскае валачобніцтва ў вёсцы Пагост**
вуліцы вёскі Пагост і двары мясцовых жыхароў
12.00 – 13.00

**Традыцыйнае Юраўскае гулянне ў вёсцы Пагост**
пляцоўка ля Пагосцкага клуба-бібліятэкі
Гульнёва-танцавальныя пляцоўкі для гасцей і ўдзельнікаў свята
13.00 – 14.00
Прэзентацыя караваяў і святочны пачастунак
14.00 – 15.00

**Урачыстае адкрыццё фестывалю «КАРАГОДНАЕ КОЛА»**
пляцоўка ля Пагосцкага клуба-бібліятэкі
Святочны канцэрт фальклорных калектываў
«Вясна-красна на ўвесь свет!»
15.00 – 16.30

**Вечарына традыцыйных беларускіх танцаў**
Тураўскі гарадскі дом культуры
20.00 – 22.00

## 7 мая 2024 года

**Культурна-адукацыйныя праграмы**
па краязнаўству Тураўшчыны
Тураўскі краязнаўчы музей
9.30 – 11.00

**Творчая акцыя**
**«Песні над Прыпяццю»**
Розныя лакацыі ў цэнтры г. Тураў
11.30 – 12.30

**Фотавыстаўка**
**«Дакрануцца да спадчыны душой»**
Тураўскі гарадскі дом культуры
13.00 – 14.00

**Канцэрт-прэзентацыя ўдзельнікаў фестывалю**
**«Захавальнікі спадчыны»**
Тураўскі гарадскі дом культуры
14.00 – 16.00

**Урачыстае закрыццё фестывалю**
**«КАРАГОДНАЕ КОЛА»**
Тураўскі гарадскі дом культуры
16.00 – 16.30

# Народны фальклорна-этнаграфічны ансамбль «Міжрэчча»

## філіяла «Пагосцкі клуб-бібліятэка» ДУК «Жыткавіцкі раённы цэнтр народнай творчасці і арганізацыі вольнага часу насельніцтва»



Народны фальклорна-этнаграфічны ансамбль «Міжрэчча» быў створаны ў 1981 г. Калектыў атрымаў назву па месцы знаходжання вёскі Пагост у міжрэччы ракі Прыпяць і яе прытокаў Сцвігі і Гарыні. Стварыла і доўгі час кіравала калектывам Кацярына Аляксееўна Панчэня. З 2010 г. кіраўніцтва калектывам прыняла Наталля Уладзіміраўна Марозава, з 2018 г. кіравала ансамблем Ірына Ціханаўна Торчык. З 2022 г. кіраўніком з'яўляецца малады і таленавіты Данііл Іванавіч Торчык. Удзельнікаў ансамбля, узрост якіх ад 16 да 80 гадоў, аб'ядноўвае любоў да народнай песні, традыцый і звычаяў сваёй мясцовасці. Калектыў працягвае справу сваёй стваральніцы, захавальніцы мясцовых абрадавых і спеўных традыцый, Кацярыны Аляксееўны Панчэня, якая нястомна садзейнічала зберажэнню, развіццю і перадачы народных традыцый маладому пакаленню.

Удзельнікі калектыву з любоўю, шанаваннем і беражлівасцю адносяцца да вуснай спадчыны сваіх продкаў. Менавіта таму галоўнае месца ў калектыве адведзена выкананню традыцыйных песень Тураўшчыны, пераняттых ад старэйшых жыхароў вёскі, удзельніц калектыву: Кацярыны Аляксееўны Панчэня, Зосі Рыгораўны Кузміч, Марыі Дзянісаўны Валанцэвіч, Галіны Рыгораўны Літвінка, Аляксандры Мікіцічны Зохна, Юліі Нікіфараўны Панчэня.

Аснову рэпертуару калектыву складаюць шматлікія мясцовыя песні, арыгінальнасці праграмам дадаюць карагоды «Дрэма», «Бабуся», «Парасці, кропе» і інш. Важнае месца займаюць песні каляндарна-абрадавага цыкла, якія сведчаць аб захаванасці ў Пагосце народных свят і абрадаў: «Раство», «Калядкі», «Гу, вясна!» і інш. Адметнасцю мясцовай традыцыі з'яўляецца абрад «Юраўскі карагод» на свята Юр'я 6 мая, які суправаджаецца ўнікальнымі па сваёй самабытнасці карагоднымі песнямі і абрадавымі дзеяннямі. Традыцыя яго святкавання была ўключана ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь і ў Спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны, якая патрабуе тэрміновай аховы (ЮНЕСКА).

# Народны фальклорны ансамбль «Дубравіца»

філіяла «Рычоўскі цэнтр традыцыйнай культуры»
ДУК «Жыткавіцкі раённы цэнтр народнай творчасці
і арганізацыі вольнага часу насельніцтва»



Назву «Дубравіца» калектыў атрымаў ад дубравы, якая знаходзіцца каля аграгарадка Рычоў уздоўж берага ракі Сцвіга. Заснавальнікам і першым кіраўніком ансамбля з'яўляўся Васіль Пятровіч Лукашэвіч, настаўнік мясцовай сярэдняй школы. З 1999 г. ансамблем кіруе Ганна Мікалаеўна Бурак, таленавіты носьбіт мясцовай традыцыйнай культуры.

Адметны спеўны стыль Тураўскага міжрэчча Прыпяці – Сцвігі, які захоўвае і папулярызуе ансамбль, у 2016 г. ўключаны ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

Самабытную песенную культуру родных мясцін ансамбль «Дубравіца» раскрывае праз шырокую жанравую разнастайнасць свайго рэпертуару. Акрамя жанраў традыцыйнага каляндарна-земляробчага цыкла, надзвычай поўна прадстаўлены вясельны цыкл, у тым ліку каравайныя песні. Традыцыйна па-палеску спяваюць удзельнікі калектыву калядныя, веснавыя, а таксама «лесавыя» песні. Апошнія выконваюць, калі ідуць у лес збіраць грыбы і ягады, калі зграбаюць і нарыхтоўваюць сена. Па сюжэтах «лесавыя» блізкія іншым пазаабрадавым песням – гэта песні пра каханне, цяжкае жыццё замужняй жанчыны ўдалечыні ад родных, музыка такіх песень характарызуецца распеўнасцю, свабодным рытмам, да абрадавага рэпертуару яны блізкія невялікім дыяпазонам. Пазаабрадавыя песні – гэта і спевы з падводкай, характэрныя для Палесся. Асаблівасцю творчай дзейнасці калектыву з'яўляецца захаванне традыцыі мужчынскага выканальніцтва: мужчыны спяваюць як разам з жанчынамі, так і асобна.

Калектыў прымае актыўны ўдзел у разнастайных мерапрыемствах, запісах тэле- і радыёперадач, адзначаны дыпломамі абласных і рэспубліканскіх фестываляў.

# Народны фальклорны калектыў «Веціца»

## філіяла «Старажавецкі клуб-бібліятэка» ДУК «Жыткавіцкі раённы цэнтр народнай творчасці і арганізацыі вольнага часу насельніцтва»




Народны фальклорны калектыў «Веціца» створаны ў 1945 г. пры Старажавецкім сельскім клубе. Яго арганізатарам і кіраўніком была Параскева Мікалаеўна Занкевіч, якая ў той час працавала загадчыцай мясцовай бібліятэкі. З 1963 г. калектывам кіравала Ніна Яфімаўна Іванова, з 1976 г. узначальвае калектыў «Веціца» загадчыца клуба Анастасія Саваўна Бердава. Ішоў час, мяняліся ўдзельнікі калектыву і кіраўнікі.

З 1989 г. калектывам кіруе загадчыца мясцовага клуба Алена Фёдараўна Якубоўская. Зараз у калектыве 8 чалавек. У ансамблі спяваюць і маладыя, і старыя носьбіты мясцовага фальклору. Асноўная мастацкая каштоўнасць калектыву – песні мясцовых абрадаў, свят. Спяваючы і адраджаючы іх, удзельнікі пазнаюць прыгажосць нацыянальнай культуры сваіх продкаў, і гэта не парадокс: усхваляючы спрадвечныя святыні, пакланяючыся ім, спявачкі чэрпаюць у іх жыццёвую энергію, цудоўную моц, якая зноў увасабляецца ў песню – і ў гэтым сакрэт яе неўміручасці.

Калектыў працуе ў напрамках адраджэння народных традыцый, захавання манеры і галасавядзення традыцыйных народных спеваў, павышэння выканаўчага ўзроўню.

Рэпертуар калектыву разнастайны і цікавы. Манера спеваў адпавядае дыялекту, уласціваму рэгіёну Палесся. Захоўваючы традыцыі ў натуральных умовах, удзельнікі гурта напоўнены жаданнем пазнаёміць з мастацтвам сваёй вёскі як мага больш людзей.

# Народны сямейны фальклорны ансамбль «Абібок»

філіяла «Запясоцкі клуб-бібліятэка»
ДУК «Жыткавіцкі раённы цэнтр народнай творчасці і арганізацыі вольнага часу насельніцтва»



Сямейны ансамбль народнай музыкі «Абібок» арганізаваны ў 1994 г. на базе Запясоцкага сельскага клуба. Яго стваральнікам і нязменным кіраўніком з'яўляецца Валянціна Канстанцінаўна Барыгіна. У 2007 г. ансамбль атрымаў  найменне «народны». У 2022 г. калектыў змяніў назву на народны сямейны фальклорны ансамбль «Абібок». Калектыў старанна прапагандуе сваю спадчыну, сямейныя традыцыі, якія склаліся даўно. Кожны з удзельнікаў ансамбля валодае ігрой на некалькі музычных інструментах. На гармоніку граюць Валянціна Канстанцінаўна і яе муж, малодшая ўнучка – на бубенчыку, старэйшая ўнучка – на дудцы, брат – на турэцкім барабане, бубне. Усе ўдзельнікі не толькі іграюць, але і выдатна спяваюць, танчаць. Сяргей Кузьміч (муж) закончыў Тураўскую дзіцячую музычную школу па класу баяна, Гродзенскае вучылішча культуры і атрымаў кваліфікацыю кіраўніка харавога самадзейнага калектыву, таму ўсе апрацоўкі робіць сам, а таксама складае арыгінальныя музычныя кампазіцыі.

У рэпертуар ансамбля ўваходзіць інструментальная музыка мясцовага паходжання, якая перадавалася ў сям'і Абібок ад пакалення да пакалення. Сюды ўваходзяць песні і танцы, якія існавалі ў вёсцы Запясочча. Карыстаюцца вялікай папулярнасцю ў слухачоў музычна-танцавальная кампазіцыя «Гулянка» і мясцовыя прыпеўкі. У сваёй творчасці ансамбль «Абібок» імкнецца вывучыць як мага больш твораў і перадаць сямейныя традыцыі, надаючы новае жыццё тым найгрышам, якія шмат гадоў жылі ў памяці дзядоў і прадзедаў, жыхароў вёскі Запясочча і навакольных вёсачак Тураўшчыны.

# Народны фальклорны ансамбль «Запясочанка»

філіяла «Запясоцкі клуб-бібліятэка»
ДУК «Жыткавіцкі раённы цэнтр народнай творчасці і арганізацыі вольнага часу насельніцтва»




Фальклорны калектыў «Запясочанка» створаны ў 1977 г. пры Запясоцкім сельскім клубе. Яго арганізатарам і першым кіраўніком была Марыя Дзянісаўна Нікіценка. Мэтай яго стварэння стала захаванне і зберажэнне мясцовага фальклору ў яго спрадвечным выглядзе.

Доўгія гады кіравала калектывам Марыя Уладзіміраўна Лузай, якая ведае шмат старадаўніх песень, танцаў, свят і абрадаў, мае моцны і прыгожы голас. Яна сапраўдны носьбіт мясцовых традыцый, знаўца звычаяў, павер'яў, якія бытавалі ў вёсцы, што засталіся ёй у спадчыну ад бабуль і матулі. Дзякуючы яе намаганням і шчырай працы з калектывам, у вёсцы і да цяперашняга часу жывуць старадаўнія абрады: «Каляды», «Шчадрэц», «Гуканне вясны», «Пярэзвы», «Зборная субота», «Зліўкі», «Пірагі» і многія іншыя.

Зараз калектывам кіруе Галіна Іванаўна Клаўшына, пастаянная ўдзельніца і вучаніца Марыі Уладзіміраўны Лузай.

# Народны фальклорна-этнаграфічны ансамбль «Лянок»

філіяла «Буразьскі сельскі клуб фальклору»
ДУК «Жыткавіцкі раённы цэнтр народнай творчасці і арганізацыі вольнага часу насельніцтва»



Народны фальклорна-этнаграфічны ансамбль «Лянок» філіяла «Буразьскі сельскі клуб фальклору» створаны ў 1946 г. Назва гурта ўтварылася ў сувязі з вырошчваннем і апрацоўкай лёну. Спявалі песні падчас вячорак пра лён, таму і вырашылі ў гонар дадзенай культуры назваць калектыў «Лянок». Заснавальнікам і кіраўніком ансамбля доўгі час з'яўляўся Якаў Кірылавіч Дрынеўскі – малады чалавек (родам з вёскі Тонеж), які прыехаў у вёску Буразь працаваць настаўнікам у мясцовай школе.

У склад калектыву ўваходзілі 9 мясцовых спявачак. Менавіта яны з'явіліся тым ядром, вакол якога пачалі згуртоўвацца і іншыя жанчыны. Цяпер у калектыве 8 чалавек розных прафесій і узросту, якіх аб'яднала любоў да спадчыны, роднага кутка і вялікая цяга да мастацтва.

У 1989 г. калектыў атрымаў ганаровае найменне «народны аматарскі калектыў». У 1993 г. кіраўніком ансамбля стала яго нязменная ўдзельніца Кацярына Сцяпанаўна Блоцкая, а ў 2009 г. – Анастасія Рыгораўна Валюшыцкая. З 2011 г. калектыў узначальвае Валянціна Віктараўна Дарошка.

Самабытнае майстэрства ансамбля «Лянок» заўсёды выклікае захапленне і ўдзячнасць гледачоў, у яго цікавая і арыгінальная праграма. Рэпертуар калектыву складаецца з песень каляндарнага і сямейна-абрадавага цыклаў, а таксама жартоўных песень. Ансамбль вядомы не толькі ў раёне, але і за яго межамі. Ён удзельнік раённых, абласных, рэспубліканскіх аглядаў-конкурсаў, фестываляў, свят фальклору.

# Народны фальклорна-этнаграфічны ансамбль «Спасаўка»

філіяла «Чэрніцкі клуб-бібліятэка»
ДУК «Жыткавіцкі раённы цэнтр народнай творчасці і арганізацыі вольнага часу насельніцтва»



Багатая на таленты старажытная Тураўская зямля, дзе жыве стaранны, таленавіты народ, які шануе сваю культуру. У гэтым песенным краі працуе шмат цікавых калектываў мастацкай самадзейнасці, адзін з іх – фальклорна-этнаграфічны ансамбль «Спасаўка», які створаны ў 1962 г. Заснавальнікам з'яўлялася Валянціна Васільеўна Маркевіч, якая ў той час працавала загадчыцай мясцовага сельскага клуба. У склад калектыву ўваходзяць 7 мясцовых спявачак розных прафесій і ўзросту, якіх звязала любоў да спадчыны свайго краю, яго адметных меладычных песень. Зараз калектывам кіруе Кацярына Іванаўна Санец.

Самабытнае майстэрства ансамбля «Спасаўка» заўсёды выклікае захапленне і ўдзячнасць гледачоў. Фальклорныя праграмы цікавыя і арыгінальныя. Рэпертуар ансамбля складаецца з песень каляндарнага і сямейна-абрадавага цыклаў. Удзельніцы любоўна апяваюць свой край, з вялікай пашанай ставяцца да песень сваіх бабуль і маці, выдатна перадаюць іх маладому пакаленню.

Ансамбль «Спасаўка» вядомы не толькі ў раёне, але і за яго межамі. Ён удзельнік раённых, абласных, рэспубліканскіх аглядаў-конкурсаў, фестываляў, свят фальклору. Удзельнікі народнага фальклорна-этнаграфічнага ансамбля «Спасаўка» філіяла «Чэрніцкі клуб-бібліятэка» праводзяць фальклорныя праграмы для турыстаў у гасцінічным комплексе «Струмень» ААТ «Тураўшчына» і сумесна з ДУ «Нацыянальны парк “Прыпяцкі”».

# Народны фальклорны ансамбль «Сцвіжанка»

філіяла «Сямурадскі сельскі клуб»
ДУК «Жыткавіцкі раённы цэнтр народнай творчасці
і арганізацыі вольнага часу насельніцтва»



Ансамбль «Сцвіжанка» арганізаваны ў 1981 г. Стваральнікам стала Ганна Лой. Назва калектыву ўтварылася ў гонар ракі, каля якой стаіць вёска з яе тысячагадовай гісторыяй, традыцыямі народа. Пачаліся канцэрты, калектыў адразу палюбілі гледачы. У першы склад уваходзілі 15 удзельнікаў. Ганаровае найменне «народны» ансамблю прысвоена ў 1990 г.

Беглі гады. З 1994 г. – кіраўнік ансамбля Анастасія Фёдараўна Рыдзецкая, а 2004 г. кіраўнікамі былі маладыя, таленавітыя ўдзельнікі, якія пачыналі з дня яго заснавання, – Любоў Мікалаеўна і Уладзімір Мікалаевіч Клімавічы. З 2019 г. кіраўніком з'яўляецца Таццяна Леанідаўна Чэчка. Сёння ў калектыве 8 удзельнікаў.

Дзейнасць калектыву накіравана на захаванне і адраджэнне мясцовых народных абрадаў і традыцый. У ансамблі спяваюць народныя лірычныя і абрадавыя песні, якія выконваюць a cappella і з акампанементам (баян). У рэпертуары, які пастаянна абнаўляецца і папаўняецца мясцовымі песнямі, налічваецца больш за 60 твораў. Вялікая ўвага надаецца стварэнню яркіх, маляўнічых выступленняў. Калектыў адрозніваецца сваёй працавітасцю, арганізаванасцю, адказнасцю. Каб ансамбль адпавядаў фальклорнаму кірунку, удзельнікі захоўваюць і касцюмы мясцовага паходжання (пашытыя сваімі рукамі, вышываныя гладдзю і крыжыкам фартухі і кашулі, спадніцы з галенамі, кабаты з рознакаляровымі стужкамі).

# Народны фальклорны ансамбль «Хільчанка»

філіяла «Хільчыцкі сельскі клуб»
ДУК «Жыткавіцкі раённы цэнтр народнай творчасці і арганізацыі вольнага часу насельніцтва»



Народны фальклорны ансамбль «Хільчанка» філіяла «Хільчыцкі сельскі клуб» арганізаваны ў 1950 г. Стваральнікам і першым кіраўніком быў Сяргей Рыгоравіч Белко, які ў той час працаваў бібліятэкарам. У 2012 г. калектыву прысвоілі ганаровае найменне «народны». Сёння кіруе калектывам Аляксандра Фёдараўна Кашэвіч, акампаніятар Фёдар Ігнатавіч Батура. У склад калектыву ўваходзіць 7 чалавек ва ўзросце ад 45 да 72 гадоў, якіх аб'ядноўвае любоў да песні і велізарнае творчае жаданне. Удзельнікі маюць добрыя вакальныя дадзеныя. Нязменны склад з'яўляцца важнай умовай для ўдасканалення выканальніцкага майстэрства. У рэпертуар уключаны лірычныя, народныя, ваенна-патрыятычныя песні, праводзіцца пастаянная праца над яго абнаўленнем і пашырэннем.

Народны фальклорны ансамбль «Хільчанка» вядзе актыўную канцэртную дзейнасць і добра знаёмы жыхарам Жыткавіцкага раёна, з'яўляецца ўдзельнікам мерапрыемстваў на канцэртных пляцоўках гарадоў Тураў і Жыткавічы. За перыяд творчай дзейнасці народны фальклорны ансамбль «Хільчанка» прымаў удзел у раённых і абласных фестывалях і конкурсах.

# Фальклорны ансамбль «Напарачка»

ДУК «Любанскі раённы цэнтр культуры»



Фальклорны ансамбль «Напарачка», створаны ў 2012 г., назву запазычыў ад мясцовага традыцыйнага танца, які больш нідзе не сустракаецца ў Беларусі. У аснову рэпертуару ўвайшлі традыцыйныя народныя танцы Любаншчыны, карагоды, прыпеўкі. Больш 40 танцаў і варыянтаў іх выканання ведаюць удзельнікі гурта. Кожная рэпетыцыя калектыву – гэта своеасаблівая вечарына, а выступленні – свята для ўдзельнікаў і гледачоў. Ансамбль любіць выступаць на маленькіх вясковых пляцоўках, дзе атмасфера ствараецца натуральна з мясцовага паветра і ўсмешак гледачоў. У калектыве людзі рознага ўзросту і сярод старэйшага складу носьбіты мастацкіх традыцый. У музычным складзе ансамбля – Васіль Семашкевіч і Мікалай Юніцкі, вядомыя на ўсю краіну музыкі. Строі, у якіх выступае гурт, зроблены на аснове этнаграфічных строяў з вёсак Любаншчыны, кожны ўдзельнік сам ствараў свой асабісты строй, які адпавядае традыцыям той вёскі адкуль карані гэтага танцора. Выступленні гурта ператвараюцца ў экскурс па традыцыях Любаншчыны. Гурт захоўвае веды аб традыцыйных народным танцы, этыкеце, строі, ежы, святах і вечарынах.

# Новгородский фольклорный театр «Кудесы»

## Муниципальное автономное учреждение дополнительного образования «Новгородская детская музыкальная школа русского фольклора» г. Великий Новгород, Российская Федерация



Новгородский фольклорный театр «Кудесы» создан в целях сохранения русской художественной культуры Новгородской земли в 1985 г.

Участники коллектива осваивают русские певческие, хореографические, обрядовые традиции новгородцев, новгородские народные драмы «Атаман и шайка разбойников», «Царь Максемьян», вертепное представление, записанные художественным руководителем коллектива Мариной Клавдиевной Бурьяк в многочисленных экспедициях по Новгородской области.

Коллектив является обладателем Гран-при и многократным лауреатом международных и всероссийских творческих конкурсов (дипломы за последние 3 года):

*- ГРАН-ПРИ и лауреат I степени XII Международного фестиваля-конкурса «Звёзды Тавриды. Сияние Рождества-2024» (Республика Крым, 2024);*

*- ГРАН-ПРИ V Международного фестиваля-конкурса культуры и искусств «Международные дни искусств в России» (г. Великий Новгород, 2023);*

*- лауреат I степени XXIX Международного фестиваля детского, юношеского и молодежного творчества «Союз талантов России» (г. Москва, 2023);*

*- лауреат I степени фестиваля-конкурса «Вся Россия» (г. Санкт-Петербург, 2023);*

*- лауреат I степени московского юношеского фестиваля казачьей культуры «Песни нашей Победы» (г. Москва, 2023);*

*- лауреат I степени Международного фестиваля-конкурса «Жар-Птица России» (г. Москва, 2023);*

*- ГРАН-ПРИ и лауреат I открытого фестиваля-конкурса детских фольклорных коллективов «Крымский терем» (Республика Крым, 2022).*

Новгородский фольклорный театр «Кудесы» является участником всероссийских фестивалей:

- *фестиваль «Серебряное ожерелье» (г. Санкт-Петербург, 2023);*
- *театрализация с элементами карнавала и народной драмы «Колядные Цари» (аг. Семежево, Республика Беларусь, 2023);*
- *Международный фольклорный фестиваль «Соловьиная ночь» (г. Псков, 2023);*
- *открытый фольклорно-хоровой фестиваль «Лейся песня» (д. Низовицы, Псковская область, 2022, 2023);*
- *сольный концерт и торжественные мероприятия, посвященные 1160-летию Полоцка (Республика Беларусь, 2022);*
- *всероссийский фестиваль «Вся Россия» (г. Санкт-Петербург, 2022);*
- *XX Международный фестиваль фольклора и традиционной культуры «Горцы» (Республика Дагестан, 2022);*
- *межрегиональный фестиваль русской и казачьей культуры «Слава казачья» (Республика Дагестан, 2022);*
- *шоу «Страна талантов» на телеканале «НТВ» (г. Москва, 2022);*
- *Международный фестиваль славянского искусства «Русское Поле» (г. Москва, 2022);*
- *Международный фольклорный фестиваль «Золотые родники» (г. Псков, 2022).*

Новгородский фольклорный театр «Кудесы» является творческим участником социально-значимых проектов и фестивалей:

- *открытый фольклорный фестиваль-конкурс дошкольников «Традиции моего народа» (г. Великий Новгород, 2023, 2024);*
- *«Казаки Отечества на Родине России» – проект, направленный на укрепление гражданского единства и гармонизацию межнациональных отношений (г. Великий Новгород, 2023);*
- *«Военно-историческое наследие Новгородской земли: музыкально-поэтическое представление ко Дню Великой Победы» (г. Великий Новгород, 2023);*
- *фестиваль «Казачья слава» (г. Великий Новгород, 2022, 2023);*
- *V Международный фестиваль-конкурс национальных культур и фольклор «Все народы в гости к нам» (г. Великий Новгород, 2022);*
- *«Фестиваль дружбы народов», направленный на укрепление гражданского единства и гармонизацию межнациональных отношений (г. Великий Новгород, 2022).*

Художественный руководитель и основатель Новгородского фольклорного театра «Кудесы» – М. К. Бурьяк, заслуженный работник культуры Российской Федерации, лауреат премии Российской Федерации «Душа России», лауреат федерального проекта «Золотые имена народов России», награждена медалью ордена «За заслуги перед Отечеством» II степени, почетным знаком «За заслуги перед Великим Новгородом», доктор педагогических наук.





# Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь «Гасцінец» Узорны фальклорны калектыў «Вянок»

філіяла «Ракаўскі цэнтр народнай творчасці» ДУ «Валожынскі раённы цэнтр культуры»



Фальклорны калектыў «Гасцінец» створаны на базе Ракаўскага сельскага дома культуры ў 1998 г. Яго заснавальнік – Елізавета Станіслаўна Пятроўская. Адметнасцю калектыву з'яўляецца своеасаблівая манера выканання песні, максімальна прыбліжаная да аўтэнтычнага гучання песень свайго рэгіёну. 4 ліпеня 2001 г. калектыву прысвоена ганаровае найменне «народны самадзейны калектыў».

Зараз у калектыве 18 чалавек (работнікі культуры, настаўнікі, рабочыя і служачыя, студэнты, вучні мясцовай школы, пенсіянеры), якіх яднае любоў да народнай песні, павага і беражлівыя адносіны да спадчыны. Дзякуючы іх умелым рукам былі пашыты і аздоблены вышыўкай сцэнічныя касцюмы, якія адпавядаюць строям розных рэгіёнаў Беларусі. Пастаянна ладзяцца экспедыцыі па вёсках раёна з мэтай даследавання і пераймання ад носьбітаў традыцыйнай культуры розных відаў народнай творчасці: побытавых танцаў, абрадаў, песень, майстэрства выцінанкі, ткацтва паясоў. Важным здабыткам такой работы з'яўляецца рэканструкцыя валожынскага строю. Намаганнямі калектыву былі адроджаны паўзабытыя абрадавыя і пазаабрадавыя песні, адметныя побытавыя танцы, цікавыя ўзоры дзіцячага фальклору, некаторыя сямейна-абрадавыя святы «Хрэсьбіны» і «Вяселле», хрысціянскія святы «Тры каралі», «Вялікдзень», «Сёмуха», а каляндарна-абрадавыя святы «Зажынкі», «Каляды», «Масленіца», «Гуканне вясны», «Ноч на Івана Купалу» арганізоўваюцца і адзначаюцца калектывам штогод.

«Гасцінец» з'яўляецца актыўным удзельнікам раённых, абласных і рэспубліканскіх семінараў, майстар-класаў, свят фальклору, знаёміць з народнай спадчынай шматлікіх турыстаў, якія наведваюць Валожыншчыну.

У 2008 г. за вялікі ўклад у прапаганду народнай творчасці, актыўную канцэртна-гастрольную дзейнасць «Гасцінец» удастоены спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у намінацыі «Аматарская мастацкая творчасць».

Галоўныя задачы калектыву – захаванне, развіццё і перадача фальклорных традыцый малодшаму пакаленню. Таму і быў створаны дзіцячы фальклорны калектыў-спадарожнік «Вянок», які з'яўляецца пераймальнікам ведаў аб спадчыне прадзедаў, што аказвае станоўчы ўплыў на выхаванне дзяцей і моладзі.

23 ліпеня 2010 г. рашэннем калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь народнаму самадзейнаму калектыву «Гасцінец» за высокі выканальніцкі узровень, стабільную актыўную творчую дзейнасць на працягу 10 гадоў  прысвоена ганаровае званне «Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь».



## Узорны фальклорны ансамбль «Калыханка»

філіяла «Міханавіцкі цэнтр культуры»
ДУ «Мінскі раённы цэнтр культуры»



З 1989 г. ансамбль удзельнічаў у фальклорным цыкле тэлепраграм «Калыханка» (БТ). Дзеці расказвалі пра чарговае народнае свята, спявалі народныя каляндарныя песні. Гурт выступаў у школах і клубах Мінскага раёна, на розных пляцоўках Мінска і іншых месцах Беларусі. Калектыў запрашалі ў Германію, Літву, Малдову, Польшчу, Расію, Сербію, Украіну.

Дзіцячы калектыў пад кіраўніцтвам Ларысы Міхайлаўны Рыжковай вывучае народныя спевы розных жанраў з многіх рэгіёнаў Беларусі. За 35 гадоў існавання ансамбля выхаваны 8 складаў юных талентаў. Аўтарская методыка навучання і выхавання спевакоў, якая грунтуецца на народных гульнях і казках, апісана ў кнізе Л. М. Рыжковай «Выхаванне спевака: метадычны дапаможнік: з электронным дадаткам» (2022).

# Народны ансамбль народнай песні, танца і музыкі «Лявоніха»

ДУК «Капаткевіцкі гарадскі дом культуры»
Петрыкаўскага раёна



Ансамбль народнай песні, танца і музыкі «Лявоніха» створаны ў 1989 г. У складзе калектыву аматары народнай песні, побытавых танцаў, народных свят і абрадаў. У 1997 г. калектыву было прысвоена ганаровае званне «народны».

Ансамбль «Лявоніха» – дыпламант абласных, рэгіянальных, рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў «Кліч Палесся» (аг. Ляскавічы), «Сожскі карагод» (г. Гомель), «Берагіня» (г. п. Акцябрскі), «Вытокі» (г. Мінск), «Грай, гармонік» (г. Ельск), «Песні маёй краіны» (г. Мазыр), «Мяцеліца» (г. Мінск), «Славянскі базар у Віцебску» (г. Віцебск), «Мотальскія прысмакі» (г. Моталь), «Карпаты-фэст» (Украіна) і інш.

Вялікая канцэртная дзейнасць спрыяе актыўнай папулярызацыі народнай песні, традыцыйных народных і гарадскіх побытавых танцаў. Калектыў ансамбля заваяваў прызнанне і любоў мясцовага насельніцтва, ён жаданы госць на канцэртных і фестывальных пляцоўках краіны.

# Фалькорны калектыў «Каханачка»

філіяла «Прыбалавіцкі сельскі дом культуры»
ДУ «Лельчыцкі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці»



У 1947 г. створаны калектыў мастацкай самадзейнасці пры Прыбалавіцкім сельскім доме культуры. У склад уваходзілі 15 чалавек. У вёсцы Прыбалавічы любілі і паважалі фальклор. Яго багатая палітра адлюстравана ў рэпертуары артыстаў-аматараў, якія пры дапамозе народнай песні выказваюць пачуцці, яскрава перадаюць нацыянальны каларыт Беларусі.

У калектыў сёння ўваходзяць людзі сталага і сярэдняга ўзросту. Мясцовыя фальклорныя песні каляндарна-абрадавага цыкла славяцца аўтэнтычнай манерай выканання. Галоўная мэта калектыву – захаванне і папулярызацыя гісторыка-культурнай спадчыны сваёй вёскі. Калектыў вылучаецца адметнай манерай спеваў і самабытнымі народнымі строямі, аздобленымі своеасаблівым арнаментам, кашулямі і фартушкамі.

Сёння ў калектыве 12 чалавек. Лідарамі калектыву з'яўляюцца Кацярына Раманаўна Акуліч, Таццяна Уладзіміраўна Акуліч, Любоў Ярмалаеўна Акуліч, Ева Іванаўна Міхаленя. З маладосці яны вядомы чароўнымі галасамі, ведаюць мноства сумных і вясёлых старадаўніх матчыных песень. Яны шчодра перадаюць свае веды усім удзельнікам калектыву.

Фальклорны калектыў прымае актыўны ўдзел у фестывалі песеннага мастацтва «Гэты дзіўны спеў – з глыбінь народных» на прыз мастацкага кіраўніка Нацыянальнага акадэмічнага народнага хору Рэспублікі Беларусь імя Г. І. Цітовіча, народнага артыста Беларускай ССР М. П. Дрынеўскага, таксама прымае ўдзел у раённых аглядах-конкурсах, абрадавых святах «Каляды», «Зажынкі», «Дажынкі» і інш.

# Фальклорны гурт «Стажары»

Рэспубліканскае маладзёжнае грамадскае аб'яднанне «Студэнцкае этнаграфічнае таварыства»

г. Мінск



Спеўная творчасць фальклорнага гурта «Стажары» ахоплівае народныя мужчынскія спевы (жаўнерскія, рэкруцкія, прымацкія, казацкія, чумацкія, бяседныя, балады і іншыя) і лірычныя песні Усходняга і Заходняга Палесся ў дуэтным і сольным выкананні.

За невялікі час свайго існавання з 2019 г. калектыў паспяхова ўдзельнічаў у некалькіх фестывалях, запісаў першы альбом «Чорная грэчка, белыя крупы».

Крыніцамі натхнення і пераймання выканальніцкай традыцыі для гурта з'яўляюцца найперш народныя спевакі Тураўшчыны з Лельчыцкага, Жыткавіцкага, Столінскага раёнаў.

# Іван Кірчук

## Заснавальнік і кіраўнік этналабараторыі Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»



Іван Іванавіч Кірчук ужо больш 40 год папулярызуе беларускі фальклор на рэспубліканскіх і міжнародных культурных пляцоўках. Усё пачалося з першай фальклорна-этнаграфічнай экспедыцыі ў 1983 г. у Любанскі раён Мінскай вобласці. У вёсцы Сарачы ад Пелагеі Міхайлаўны Шмялёвай ён запісваў фальклор з раніцы да гадзіны ночы! Вось з таго часу захапіўся Іван Кірчук мудрасцю продкаў, пачаў вывучаць і ілюстраваць лепшыя ўзоры фальклору на канцэртах і фестывалях. У гэтым яму дапамагалі ўдзельнікі гурта «Дзіва», які ён стварыў на базе Мінскага культасветвучылішча ў 1985 г.

Падчас шматлікіх эксперыментаў з народнай манерай спеваў, у спалучэнні з рознымі інструментамі і гукавым суправаджэннем у 1995 г. Іван Кірчук стварыў гурт «Тройца». За 27 год калектыў прыняў удзел у больш як 100 фестывалях Беларусі, Расіі, Еўропы і Амерыкі. Выступаў гурт у Малайзіі, Іспаніі, Канадзе, яскрава заявіў аб сабе на трох найбуйнейшых фестывалях «Womad», якія ладзіў еўрапейскі музычны прадзюсар, спявак Пітэр Габрыэл у Англіі, Чылі, Расіі. У 1999 г. на знакамітай еўрапейскай гуказапісваючай студыі «PAN records» быў запісаны першы этнічны сольны альбом «Спадчына загінуўшых вёсак», які разышоўся амаль па ўсіх краінах свету. У ім прадстаўлены стылізаваныя аўтэнтычныя песні, сабраныя ў шматлікіх экспедыцыях па Беларусі. У якасці акампанементу гучаць найгрышы на народных музычных інструментах, зробленых майстрамі Беларусі (чарот, акарына, дудка, гуслі, дуда, ліра, смык). У той жа час прайшлі выступленні Івана Кірчука з музычнымі інструментамі, маскамі і лялечным тэатрам «Батлейка» ў 10 гарадах Босніі і Герцагавіны.

У 2002 г. на сцэне к/з «Мінск» была прадстаўлена праграма «Святы вечар», у якой аўтар выкарыстаў архіўныя запісы фоналабараторыі рэспубліканскага радыё. Менавіта гэтае выступленне дала штуршок да стварэння фальклорнага тэатра. Так, паступова вывучаючы народную мудрасць, выкладаючы ў Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя Максіма Танка сцэнічную тэатралізацыю абрадаў і манеру спеваў (1997–2016), Іван Кірчук стварыў першы монаспектакль «Варажбіт», у якім гучаць народныя песні ад калыскі да галашэння.

Вынікам экспедыцыі па Століншчыне разам з рэжысёрам Сяргеем Рыбаковым у 2005 г. стаў альбом «Століншчына» і фільм «Сонцам асвячуся», які ў 2006 г. быў унесены ў міжнародныя кінакаталогі і ўзнагароджаны дыпломам на IV нью-ёркскім міжнародным незалежным кінафестывалі (New York International Independent Film and Video Festival). У наступныя гады былі зроблены монаспектаклі «Сонцам асвячуся», «Варажбіт. Працяг», «Споведзь пад стрэхамі», «Дарожка мая…».

У 2019 г. Іван Кірчук прыняў удзел у здымках дакументальнага фільма «Код продкаў» (Fresh Production Group) разам з носьбітамі фальклору Тураўшчыны падчас абраду «Юраўскі карагод». У фільме даследуюцца карані беларускага і ўкраінскага народаў, пошук іх самабытнасці праз вывучэнне меладызму славянскай этнаграфічнай спадчыны. Кінастужка атрымала галоўны прыз Гільдыі кінакрытыкаў Беларусі XXVII Minsk International Film Festival «Listapad», прыняла удзел у Madurai International Film Festival 2020 (Індыя) і 29th International Festival of Ethnological Film in Belgrade (Сербія).

На працягу творчага шляху Іван Кірчук працуе не толькі з народнымі майстрамі, у якіх замаўляе мноства музычных інструментаў для сваіх монаспектакляў, але і з дызайнерамі, выкладчыкамі цэнтраў творчасці, школ, універсітэтаў. Ва ўсіх спектаклях выкарыстоўваюцца маскі казы, мядзведзя, ваўка, чорта, смерці і г.д., што не толькі ўпрыгожвае пастаноўкі, але і выклікае цікавасць у дзяцей і моладзі. За плённыя гады пошуку і працы сфарміраваўся ўнікальны тэатр беларускага фальклору, складзены з 12 рытуальных пляцовак («Вогненная рака», «Русальныя розгары», «Дзяды» і інш.), у які ўвайшлі амаль 50 народных песень, музычныя найгрышы на народных інструментах, замовы і павер'і беларусаў, фрагменты абрадаў і свят прадзедаў, жыхароў вёскі Запясочча і навакольных вёсачак Тураўшчыны.



Фальклорныя калектывы
кафедры народна-песеннай творчасці і фальклору
факультэта музычнага і харэаграфічнага мастацтва
ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»
(спецыяльнасць «Народная творчасць», спецыялізацыя «Этнафоназнаўства»)

## Фальклорны ансамбль «Страла»



Фальклорны гурт «Страла» створаны ў 2011 г. (спецыялізацыя «Этнафоназнаўства» кафедры этналогіі і фальклору Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў) старшым выкладчыкам Эвелінай Вячаславаўнай Шчадрыной, якая з'ўляецца мастацкім кіраўніком калектыву. Удзельнікі «Стралы» займаюцца вывучэннем рэгіянальнай вакальнай і інструментальнай этнафоніі беларусаў праз аўдыя- і відэаматэрыялы, назапашаныя Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі, Беларускай дзяржаўнай акадэміяй музыкі і шляхам пераймання ад носьбітаў фальклору ва ўласных экспедыцыях. У рэпертуары песні, карагоды, гульні і танцы каляндарна-абрадавага, сямейна-абрадавага і пазаабрадавага цыклаў беларускага фальклору, а таксама прадстаўленні беларускай батлейкі.

«Страла» з'яўляецца лаўрэатам міжнародных конкурсаў «Как на речке было на Фонтанке» (г. Санкт-Пецярбург, лаўрэат І прэміі), «Сибирская распутица» (г. Цюмень, І прэмія), «Lobeska baba wielkanocna» (г. Шчэцін, Польшча, лаўрэаты ІІ і ІІІ ступені) «Сибирские родники» (г. Цюмень, лаўрэаты ІІ ступені) і фестываляў у г. Санкт-Пецярбург (Расія), г. Вісагінас (Латвія), г. Вільнюс (Літва), «Берагіня» (г. п. Акцябрскі, Гомельская вобл.), «Камяніца» (в. Азярцо, Мінскі р-н) і інш. У 2012 г. першы набор студэнтаў «Стралы» стаў удзельнікам фальклорна-сімфанічнага праекта «Колаварот» сумесна з асацыяцыяй маладых беларускіх кампазітараў, у якім беларуская этнафонія была прадстаўлена ў афарбоўцы аркестра Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, затым аркестра Белтэлерадыёкампаніі і ансамбля салістаў «Класік-авангард» Белдзяржфілармоніі (на Міжнародным музычным фестывалі імя І. Салярцінскага ў Віцебскай абласной філармоніі).

Інструментальная этнафонія ў калектыве агучана дыятанічнымі цымбаламі, колавай лірай, бубнам з бразготкамі (аўтэнтычныя інструменты з прыватнай калекцыі мастацкага кіраўніка «Стралы» Э. В. Шчадрыной), а таксама скрыпкай з вясельным барабанам.

Пасля 2011 г. былі яшчэ два наборы студэнтаў у калектыў «Страла» ў 2015 і 2020 гг. Апошні набор заканчвае навучанне ў чэрвені 2024 г. разам з існаваннем калектыву ў сувязі са спыненнем набору студэнтаў на спецыялізацыю «Этнафоназнаўства».

## Фальклорны ансамбль «Этнасуполка»



Фальклорны калектыў «Этнасуполка» бярэ свой пачатак на кафедры этналогіі і фальклору спецыялізацыі «Этнафоназнаўства» ў 2004 г. і ўяўляе сабой этнафанічную майстэрню дацэнта кафедры народна-песеннай творчасці і фальклору Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў (БДУКМ) Таццяны Аляксандраўны Пладуновай. Ансамбль «Этнасуполка» мяняў свой склад паводле змены студэнцкіх набораў у майстэрню (2004–2009, 2010–2015, 2014–2018, 2018–2022). Сёння ўдзельнікі ансамбля – студэнты 2 і 3 курсаў (набор 2021 і 2022 гг.), якія маюць вопыт экспедыцыйнай працы і ўключанага назірання за традыцыямі вёсак Жыткавіцкага, Лельчыцкага, Кобрынскага, Маларыцкага раёнаў, і гэты вопыт з'яўляецца дакументальнай асновай іх творчасці.

Жанравы кірунак калектыву – каляндарныя, сямейна-абрадавыя і пазаабрадавыя спевы, ігра на беларускіх музычных інструментах (дудка, скрыпка, цымбалы, гармонік, бубен, вясельны барабан), інтэрактыўная танцавальна-гульнёвая дзейнасць. Песенны і музычны рэпертуар гурт пераймае ад аўтэнтычных носьбітаў, дзякуючы аўдыя- і відэакалекцыям айчынных фалькларыстаў З. Мажэйка, Т. Варфаламеевай, І. Назінай, Г. Таўлай, Г. Кутыровай, Р. Гамзовіч, М. Козенкі і інш. Назапашыны этнафанічны вопыт «Этнасуполкі» адлюстраваны ў яе мастацкіх праграмах, прадстаўленых на шматлікіх канцэртных пляцоўках г. Мінска: «Калядаванне і шчадраванне на Палессі», абрадавая гульня «Яшчар», «Масленіца», «Гуканне вясны», «Валачобны абход», «Купалле».

Мастацкі кіраўнік калектыву Т. А. Пладунова – фальклорная спявачка, хормайстар, этнафоназнаўца, рэжысёр і вядучая народных свят і этнаграфічных канцэртаў (рэспубліканскае Купалле на фестывалі «Берагіня» (2008–2018), абрадавыя святы «Юр'я» (2006), «Зялёныя святкі» (2007), «Гуканне вясны» (2009–2013) у Цэнтральным дзіцячым парку імя Максіма Горкага (г. Мінск), цыкл этнаграфічных канцэртаў «Фальклор беларускай глыбінкі» ў БДУКМ (2009–2019); лаўрэат міжнародных фестываляў Еўрапейскага вяшчальнага саюза (г. Кёльн, Германія, 2010; г. Апатыя, Харватыя, 2012).

За гады існавання творчай майстэрняй «Этнасуполка» атрыманы дыпломы на многіх рэгіянальных, рэспубліканскіх і міжнародных фестывалях, сярод якіх Міжнародны фальклорны фестываль «Наследники традиций» (г. Санкт-Пецярбург, Расія, 2007); Міжнародны фестываль студэнцкай музыкі (Францыя, 2007); Міжнародны фальклорны фестываль «Балтыка» (Літва, 2014); рэспубліканскі фестываль фальклорнага мастацтва «Берагіня» (г. п. Акцябрскі, Гомельская вобл., 2008); абласны фальклорны фестываль «Радавод» (г. Іванава, 2013, г. Кобрын, 2016); Міжнародны фальклорны фестываль «Вселиственный венок» (г. Санкт-Пецярбург, Расія, 2014) – дыплом І ступені; Міжнародны фальклорны фестываль «Лобецка баба» (г. Лобез, Польшча, 2018) – Гран-пры фестывалю; Міжнародны конкурс салістаў і ансамбляў народнай культуры «Сибирские родники» (г. Цюмень, Расія, 2020) – дыплом ІІ ступені; Міжнародны фальклорны фестываль «Как на речке было на Фонтанке» (г. Санкт-Пецярбург, Расія, 2021) – дыплом ІІІ ступені і спецыяльны дыплом журы «За сохранение традиций белорусской культуры».

**Фальклорныя калектывы Жыткавіцкага раёна запрашаюць на традыцыйныя абрады і святы на працягу ўсяго года***

| Калі | Якое свята | Хто запрашае | Дзе адбываецца |
|---|---|---|---|
| 6 мая | Юр'я | Народны фальклорна-этнаграфічны ансамбль «Міжрэчча»<br>Народны фальклорны ансамбль «Дубравіца»<br>Народны фальклорна-этнаграфічны ансамбль «Спасаўка»<br>Народны фальклорны калектыў «Веціца» | в. Пагост<br>аг. Рычоў<br>в. Чэрнічы<br>в. Старажоўцы |
| 23 чэрвеня | Свята Тройцы | Народны фальклорна-этнаграфічны ансамбль «Лянок» | в. Буразь |
| 19 жніўня | Народнае свята «Яблычны Спас» | Народны фальклорна-этнаграфічны ансамбль «Спасаўка» | в. Чэрнічы |
| 6 верасня | Абрад «Жаніцьба Коміна» | Народны фальклорна-этнаграфічны ансамбль «Лянок» | в. Буразь |
| 9 верасня | Абрад «Жаніцьба Коміна» | Народны фальклорна-этнаграфічны ансамбль «Міжрэчча» | в. Пагост |
| 27 верасня | Верасніцкі кермаш** | Народны фальклорна-этнаграфічны калектыў «Верас» | в. Верасніца |
| 14 кастрычніка | Пакроўскі кермаш** | Народны фальклорны калектыў «Веціца» | в. Старажоўцы |
| 21 лістапада | Міхайлаўскі кермаш** | Народны фальклорны ансамбль «Дубравіца» | аг. Рычоў |
| 7 студзеня | Раство Хрыстова | Народны фальклорна-этнаграфічны ансамбль «Міжрэчча» | в. Пагост |
| 13 студзеня | Шчодрык | Народны фальклорна-этнаграфічны ансамбль «Міжрэчча» | в. Пагост |
| 13 студзеня | Шчодрык | Народны фальклорны ансамбль «Дубравіца» | аг. Рычоў |
| 22 сакавіка | Абрад «Сорак святых» | Народны фальклорна-этнаграфічны ансамбль «Міжрэчча» | в. Пагост |
| Апошні дзень Масленіцы | «Гу, вясна!» | Народны фальклорна-этнаграфічны ансамбль «Міжрэчча» | в. Пагост |

** Пры намеры наведаць свята неабходна ўзгадніць праграму свайго ўдзелу з кіраўніком адпаведнага філіяла ДУК «Жыткавіцкі раённы цэнтр народнай творчасці і арганізацыі вольнага часу насельніцтва».*

*** Кермаш – мясцовая назва свята, якое ў кожнай вёсцы прымеркавана да пэўнай хрысціянскай урачыстасці. Свята ўключае абавязковае наведванне храма, гасцяванне, традыцыйнае народнае гулянне і адрозніваецца ад кірмаша, на якім звычайна гандлююць.*

# КАРАГОДНАЕ КОЛА



**Этычны кодэкс**
**стасункаў з носьбітамі нематэрыяльных культурных каштоўнасцей у Жыткавіцкім раёне Гомельскай вобласці**

**Памятка аб правілах паводзін і этычнай камунікацыі з носьбітамі традыцыі для гасцей в. Пагост падчас правядзенння вясновага абраду «Юраўскі карагод»**

1. У Жыткавіцкім раёне захоўваецца багата адметных праяўленняў нематэрыяльнай творчасці чалавека, якія да сённяшняга дня з'яўляюцца жывой часткай культуры многіх вясковых жыхароў. Шэсць элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны (далей – НКС) раёна ўключаны ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь:

– вясновы абрад «Юраўскі карагод», які праводзяць штогод жыхары вёскі Пагост 6 мая;

– спеўны стыль Тураўскага міжрэчча Прыпяці – Сцвігі, які захоўваюць удзельніцы народнага фальклорнага калектыву «Дубравіца» ў аграгарадку Рычоў;

– традыцыя вырабу прыпяцкага чоўна майстрамі вёскі Перароў;

– традыцыя прыгатавання і спажывання страў з таркаванай бульбы, шырока распаўсюджаная ў раёне;

– мастацкія практыкі саломапляцення і мастацтва выцінанкі Гомельскай вобласці, увасобленыя майстрамі Жыткавіцкага раёна.

2. Вясновы абрад «Юраўскі карагод» (абрад «Юр'я» / свята «Юр'я») штогод ладзіцца ў вёсцы Пагост 6 мая ў дзень памяці вялікамучаніка Георгія (Юрыя, Ягорыя) Пераможцы. Гэты абрад адным з першых у Рэспубліцы Беларусь атрымаў статус нематэрыяльнай гісторыка-культунай каштоўнасці ў 2004 г. і ўключаны ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

3. У 2019 г. вясновы абрад «Юраўскі карагод» уключаны ў Спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА, якой патрабуецца тэрміновая ахова. Гэты Спіс складаецца ў рамках Канвенцыі аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны 2003 года, ратыфікаванай Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 29.12.2004 № 627.

4. Павага да нематэрыяльнай культурнай спадчыны розных супольнасцей, груп і прыватных асоб – найважнейшая мэта Канвенцыі 2003 года, паколькі нематэрыяльная спадчына не існуе незалежна ад людзей, якія яе ствараюць і рэалізуюць!

5. Просім захоўваць этычныя прынцыпы стасункаў з носьбітамі нематэрыяльнай культурнай спадчыны пры знаёмстве з багатай традыцыйнай культурай Палесся, увасобленай жыхарамі Жыткавіцкага раёна:

5.1. пры наведванні абрадаў і свят прадстаўнікамі СМІ, навуковых арганізацый, устаноў культуры, адукацыі, турызму з прафесійнымі мэтамі неабходна ажыццяўляць камунікацыю з носьбітамі пры

ўмове іх свабоднай, папярэдняй, інфармаванай згоды аб мэтах і выніках такой камунікацыі; выконваць рэкамендацыі і просьбы супрацоўнікаў мясцовых арганізацый культуры, якія ажыццяўляюць дапамогу ў правядзенні традыцыйных цырымоній; не ўмешвацца і не перашкаджаць ажыццяўленню прынятых у дадзенай мясцовасці форм правядзення абрадаў і свят;

5.2. пры наведванні традыцыйных абрадаў і свят у фармаце культурна-пазнавальнага турызму неабходна атрымаць інфармацыю ў супрацоўнікаў мясцовых арганізацый культуры аб магчымых формах удзелу, даступных для ўсіх наведвальнікаў і абмежаваных для шырокай грамадскасці;

5.3. неабходна памятаць, што забаўляльны кампанент такіх мерапрыемстваў можа быць абмежаваны, таму актыўна далучацца да падзеі варта толькі па запрашэнню гаспадароў;

5.4. пры рэалізацыі намеру далучыцца да канкрэтных абрадавых і творчых практык або пераймання традыцыі, веды і навыкі неабходна набываць загадзя ў непасрэдным узаемадзеянні і кансультацыях з носьбітамі, паважаючы іх маральныя, матэрыяльныя правы і прыватнае жыццё, а таксама пры дапамозе супрацоўнікаў мясцовых арганізацый культуры ў межах запланаваных адукацыйных і культурных мерапрыемстваў;

5.5. нематэрыяльная культурная спадчына не павінна падвяргацца знешнім ацэнкам яе каштоўнасці, бо кожная супольнасць, група або асоба самастойна вызначаюць каштоўнасць сваіх культурных традыцый для сябе і свайго наваколля; менавіта на меркаванне прадстаўнікоў супольнасці носьбітаў неабходна абапірацца пры апісанні НКС у СМІ, навуковых даследаваннях, публікацыях у сацыяльных сетках і інфармацыйных рэсурсах;

5.6. неабходна паважаць дынамічны і жывы характар нематэрыяльнай культурнай спадчыны, першачарговае права носьбітаў уносіць змены або, наадварот, адмаўляцца ад прапаноў па змене часу, месца, паслядоўнасці правядзення традыцыйных цырымоній; любыя прапановы экспертаў і спецыялістаў павінны насіць характар навукова-абгрунтаваных рэкамендацый, адпаведных месцу, часу, а таксама магчымасцям і жаданням носьбітаў іх ажыццявіць.

6. Штогод на свята Юр'я 6 мая ў вёсцы Пагост з радасцю прымаюць гасцей, якія хацелі бы прыняць удзел у свяце і пазнаёміцца са старадаўнім абрадам «Юраўскі карагод». Пры правядзенні абраду носьбіты захоўваюць неабходны парадак у абрадавых дзеях, а гасцей просяць прытрымлівацца пэўных правіл паводзін з улікам асаблівасцей кожнага з этапаў абраду:

6.1. напярэдадні (вечарам 5 мая, альбо раніцай 6 мая) жанчыны выпякаюць пшанічны каравай пад назвай «карагод» і булачкі-перапечкі для пачастункаў;

6.2. раніцай 6 мая жанчыны і дзяўчаты збіраюцца ў клубе, каб падрыхтавацца да ўрачыстасці: дзяўчаты плятуць вянкі з барвінку, а жанчыны рыхтуюць для ўпрыгажэння «карагода» ральцы – тры галінкі пладовага дрэва з трыма разгалінаваннямі, аздобленыя цестам, зелянінай, папяровымі кветкамі і стужкамі (госці могуць далучыцца да майстар-класа па пляценню вянкоў і вырабу папяровых кветак або папрысутнічаць у клубе, пагутарыць з мясцовымі жыхарамі, пазнаёміцца з этнаграфічнай экспазіцыяй мясцовага цэнтра традыцый Пагосцкага клуба-бібліятэкі);

6.3. пасля таго, як «карагод» упрыгожаны, ладзіцца шэсце на жытнёвае поле, якое жыхары сёлета абралі для правядзення абраду (год ад году месцазнаходжанне абранага поля бывае рознае ў

сувязі з севазваротам сельскагаспадарчых культур, умовамі надвор'я і іншымі фактарамі);

6.4. на чале шэсця ідуць дзяўчаты з ручніком і мужчыны з іконай, зоркай, «карагодам» і граблямі, павязанымі фартухом (астатнія ўдзельнікі і госці ідуць за імі па вуліцах вёскі, песні ў гэты час не спяваюць);

6.5. на жытнёвае поле выходзяць толькі мясцовыя жыхары і запрошаныя імі ўдзельнікі, там яны праводзяць традыцыйныя рытуалы, спяваюць песні, водзяць карагоды вакол мужчын, якія стаяць у цэнтры з рытуальнымі прадметамі (госці назіраюць за абрадавымі дзеямі на ўскрайку поля, аматарскія фота- і відэаздымкі робяцца з такой адлегласці, якая дазваляе не патрапляць у зону правядзення абраду староннім асобам);

6.6. прафесійныя фота- і відэаздымкі абраду на полі праводзяць толькі акрэдытаваныя прадстаўнікі СМІ па ўзгадненню з асобай, упаўнаважанай Жыткавіцкім раённым выканаўчым камітэтам;

6.7. калі ўдзельнікі абраду выходзяць з поля, усе зноў далучаюцца да шэсця і ідуць па вуліцах вёскі з песнямі і музыкай;

6.8. шэсце спыняецца і водзіць карагоды ля двароў мясцовых жыхароў, якія частуюць удзельнікаў – гэта адметнае Юраўскае валачобніцтва, якое захавалася ў вёсцы Пагост (да карагодаў і спеваў на вуліцах вёскі могуць далучацца ўсе жадаючыя);

6.9. пасля вяртання ў цэнтр вёскі на пляцоўцы ля Пагосцкага клуба-бібліятэкі ладзіцца традыцыйнае Юраўскае гулянне, якое ўключае танцы, спевы, гульні, выступленні фальклорных калектываў і іншыя забавы;

6.10. традыцыйнае гулянне завяршаецца падзелам «карагода» і святочным пачастункам, наведвальнікам прапануецца набыць сувеніры і пакінуць запісы ў гасцявой кнізе.

7. Сустрэчы з удзельнікамі свята «Юр'я» – выдатная магчымасць пазнаёміцца з прадстаўнікамі розных супольнасцей носьбітаў фальклору Жыткавіцкага раёна, якія штогод далучаюцца да «Юраўскага карагоду» ў вёсцы Пагост, а таксама аднаўляюць і захоўваюць традыцыйныя абрады і святы ў сваіх вёсках.

8. Больш дзесяці фальклорных калектываў у Жыткавіцкім раёне падтрымліваюць жывыя традыцыі народнай культуры, увасобленыя ў святах каляндарнага і сямейнага цыклаў, захоўваюць музычныя традыцыі і яркія ўзоры вуснай народнай творчасці. Кожны з іх будзе рады падзяліцца каштоўнай спадчынай у яе спрадвечных аўтэнтычных формах!

*Буклет рэгіянальнага фестывалю нематэрыяльнай культурнай спадчыны «Карагоднае кола» выдадзены пры фінансавай падтрымцы Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па пытаннях адукацыі, навукі і культуры (ЮНЕСКА) у рамках міжнароднага праекта «Рэалізацыя плана аховы вясновага абраду "Юраўскі карагод" у в. Пагост Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці, уключанага ў Спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА, які патрабуецца тэрміновая ахова».*

*У буклеце выкарыстаны фота і інфармацыя пра калектывы, дасланыя ў аргкамітэт рэгіянальнага фестывалю нематэрыяльнай культурнай спадчыны «Карагоднае кола».*


Укладанне: А. Каліноўская, А. Гумінская

Дызайн і вёрстка: М. Чудук

Рэдактар: В. Жолтак

